Пролетарыі ўсіх краеў, злучайцеся!

Работніца і калгасніца Беларусі

№ 18

Верасень 1935

Галяшэвіч Ядзя
(Менскі вагонарамонтны завод імя Мяснікова)

БА 1413
И-в 1953 г.
БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

Сталінскі статут у дзеянні

Добра ўсвядомілі новы сталінскі статут у калгасе „13-годдзе Окцябрскай рэвалюцыі", Перасадскага сельсовета. Асабліва запомнілі жанчыны раздзел у статуце аб водпуску калгасніцам на месяц да і месяц пасля родаў з аплатай 50 проц. сярэдняй выпрацоўцы працадзён. Жанчыны зразумелі вялікія клопаты партыі і тав. Сталіна аб ахове здароўя мацеры і дзіцяці.

Вось і ў нас сталінскі статут у дзеянні. Нядаўна калгасніцы Лыскавец Ольга і Буслава Марыя атрымалі водпуск па цяжарнасці.

Барысаўскі раён. П. Б.

ПАРУШАЮЦЬ СТАЛІНСКІ СТАТУТ

У калгасе „Пабеда", Смалявіцкага раёна, груба парушаюць сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі. Цяжарных жанчын не пераводзяць на лягчэйшую работу, напрыклад Шчурку Лісавету. Некаторыя калгасніцы работалі да апошніх дзён перад родамі (Семіжон Варка і іншыя). Калгасніца Сурмачэўская пасля родаў адпачывала толькі тыдзень і зноў прыступіла да працы.

Старшыня калгаса Позняк Кірыла і брыгадзір брыгады № 3 Вашкевіч гавораць:
— Мы цяжарных жанчын не прымушалі працаваць, яны самі ідуць на працу.

* * *

У калгасе „Чырвоны пагранічнік", Чэрвеньскага раёна, калгасніца Ляпешка Марыля не атрымала водпуска па цяжарнасці.

У калгасе „Палітаддзелец", Чашніцкага раёна, даярка Палітанава працавала да родаў і водпуску не атрымала. Старшыня калгаса тав. Унуковіч тлумачыць гэта тым, што Палітанава быццам сама адмовілася ад водпуска. Зразумела, што калі Палітанавай растлумачылі-б, што за водпуск будзе ёй аплочана сярэдняя выпрацоўку, палавінным размеры, яна-б ад водпуска не адмовілася. У гэтых калгасах яўна парушаюць сталінскі статут.

Праўленні і старшыні калгасаў недастаткова зразумелі важнасць гэтага сталінскага пункта аб цяжарнай жанчыне і не растлумачылі калгасніцам, як будзе ім вытварацца аплата, пакуль яны будуць адпачываць.

Партыйныя арганізацыі гатых раёнаў павінны моцна ўдарыць па парушыцелях.

Работа размяркоўваецца паміж членамі арцелі непасрэдна брыгадзірам, які абавязан найлепшым чынам скарыстаць кожнага калгасніка сваёй брыгады, не дапускаючы пры размеркаванні работы ніякага кумаўства, сямейнасці, і строга ўлічваючы працоўную кваліфікацыю, вопыт і фізічную сілу кожнага, а ў адносінах цяжарных і кормячых жанчын — неабходнасць аблегчыць іх работу, вызваляючы жанчын ад работ за месяц да родаў і на месяц пасля родаў з захаваннем за імі ўтрыманя на гэтыя два месяцы ў палавінным размеры сярэдняй выпрацоўкі імі працадзён.

(З прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі).

Вырашчваць і дапамагаць

Вось ужо 18 гадоў, як на адной шостай частцы свету ў краіне Советаў працоўная жанчына палітычна і эканамічна стала роўнапраўным чалавекам. Няма ў нас такой спецыяльнасці, якая-б была прывілегіяй толькі мужчын. Жанчыны—пілоты і парашутысткі, інжынеры і навуковыя работнікі, дактары і аграномы займаюць пачэснае месца ў нашым Саюзе.

Усё больш і больш павышаецца кваліфікацыя работніц на вытворчасці. Усё больш і больш папаўняюцца рады выдатніц. А ў краінах капітала з кожным днём расце многамільённая армія беспрацоўных, галодных жанчын.

Прамова нашага любімага правадыра т. **Сталіна** на выпуску акадэмікаў і дадзены ім лозунг: „кадры рашаюць усё" ўзнялі на яшчэ-больш вышэйшую ступень пытанне аб вырашчванні і вылучэнні жаночых кадраў. За пяць месяцаў, прайшоўшых пасля прамовы, многія прадпрыемствы нашай рэспублікі дабіліся ў гэтым некаторых дасягненняў.

На швейнай фабрыцы імя Валадарскага (Магілеў) больш дзесятка работніц-ударніц вылучаны на адказную адміністрацыйную і грамадскую работу. Тут і старшыня фабкома тав. **Пекер** і начальнік змены тав. **Дымшыц** і майстар — комсамолка **Клас.**

На заводзе імя Мяснікова (Менск) работніца—токар Ядзя **Галяшэвіч** з першага верасня вылучана планавіком цэха. Ядзя Галяшэвіч без адрыву ад вытворчасці скончыла рабфак на „выдатна". На гэтым-жа заводзе работніца—столяр **Куняшкевіч** Вера вылучана на работу ў заводакіраўніцтва.

Аднак далёка не ўсюды партыйныя і профсаюзныя арганізацыі сапраўды займаюцца вырашчваннем жаночых кадраў. Наадварот, ёсць рад фактаў, калі былых вылучэнак задвінулі, калі вылучэнкі не атрымліваюць ніякай дапамогі ў рабоце.

У гэтым нумары мы змяшчаем пісьмо двух былых вылучэнак Добрушскай папяровай фабрыкі тав. **Васіленкавай** і **Цубрыкавай.** Абедзве яны старыя работніцы—комуністкі. Абедзве яны, будучы вылучэнкамі, не атрымлівалі ад парткома і фабкома ніякай дапамогі ў рабоце і іх звярнулі ў цэх. Не інакш як здзекамі над тав. Васіленка, якая 38 гадоў праработала на фабрыцы, з'яўляецца тое, што зараз яна ў цэху перакідваецца з адной работы на другую.

Добрушская фабрыка мае вялікую колькасць старых кадравых работніц, а на кіруючай рабоце іх—адзінкі. Пасля прамовы тав. **Сталіна** намецілі некаторых работніц на вылучэнне, абгаварылі іх кандыдатуры на пасяджэнні фабкома, парткома, склалі спіс і прышылі яго да справы.

Не думаюць аб вылучэнні работніц і на Гомельскай фабрыцы „Труд".

Там няма ні адной работніцы на адміністрацыйнай рабоце. Ні аднаго брыгадзіра і майстра на больш чым 200 работніц. Хіба гэта не ганьба для заводакіраўніцтва, партыйнага і фабрычнага камітэта? На гэтай-жа фабрыцы работніцы па некалькі гадоў работаюць на адным разрадзе. Не дапамаглі нават і сігналы журнала. Работніца **Шэхтман** Іда з'яўляецца лепшай ўдарніцай і чатыры гады работае на падсобнай рабоце. Аб гэтым мы пісалі яшчэ ў маі месяцы, але становішча не змянілася.

Старая комуністка партарганізацыі Віцебскай фабрыкі „КІМ" тав. **Адам-Кавалеўская** скардзіцца на тое, што яе штомесячна перакідваюць на новую работу. Гэта перашкаджае яе росту, асваенню тэхнікі і не дае магчымасці вучыцца. Скарга зусім правільная. Сакратар парткома тав. Крывулін павінен зрабіць адпаведныя вынікі.

У рабоце сярод жаночай моладзі асаблівае значэнне мае падняццё яе вытворчай кваліфікацыі. Тут далёка не ўсё ў парадку. Ёсць выпадкі, калі дзяўчаты, скончыўшыя фабзавуч, работаюць на самых ніжэйшых разрадах.

Возьмем для прыкладу Гомельскі завод імя Ланцуцкага. На ім многія дзяўчаты, скончыўшыя фабзавуч, работаюць не па сваёй кваліфікацыі. Былыя такары, слесары, на навучанне якіх дзяржава патраціла шмат сродкаў, пашлі работаць перапішчыцамі ў цэхавую канцэлярыю. У адным толькі паравоза-рамонтным цэху пяць такіх дзяўчат.

— Нам прыелася тры гады работаць на адным разрадзе,—заяўляюць многія з іх.

На гэта самае скардзіцца у сваёй заметцы комсамолка **Караскевіч** Анастасія з гэтага-ж завода.

На фабрыках і заводах пачаўся другі тур тэхнічнай вучобы. У розныя тэхнічныя гурткі і курсы неабходна ўцягнуць шырокія масы работніц. Тэхнічная вучоба дапаможа работніцам павысіць сваю вытворчую кваліфікацыю.

Цэнтральны камітэт нашай партыі ў сваёй пастанове „Аб міжнародным комуністычным жаночым дні 8 сакавіка" патрабуе ад ўсіх партыйных совецкіх і прафесіянальных арганізацый клапатлівага вырашчвання жаночых кадраў, вылучэння лепшых ударніц на кваліфікаваныя і кіруючыя работы. Па-большэвіцку выканаць гэта рашэнне— справа гонару кожнай арганізацыі.

Імені ЛЕНІНА

Елена Нікалаеўна Міцько



У невялікім пакоі пасажырскага вакзала праводзіць сваё дзяжурства па станцыі Елена Нікалаеўна **Міцько**. Чырвоная шапка і белы кіцель прыемна ўпрыгожваe яе энергічны твар.

Вось зняла яна тэлефонную трубку і паведаміла старшаму па маршруту аб гатоўнасці поезда да адпраўкі. Потым узяла зялёны сцяжок і вышла на перон адправіць поезд. Праз некалькі мінут вярнулася, зрабіла запісы ў настольным журнале і зноў узялася за трубку. Цяпер яна патрабавала ад манеўровага дыспетчера своечасовай падачы чарговых вагонаў.

Так праходзіць усё дзяжурства. Напружана, але спакойна, без крыкаў, без рыўкоў, з веданнем справы.

Елена Нікалаеўна—інжынер, малады спецыяліст транспарта. Які цяжкі жыццёвы шлях прайдзен, каб атрымаць гэта высокае званне!

* * *

У транспартнай школе на станцыі Брэст вучэбны год падыходзіў к канцу. Настаўнік трэцяй групы Нікалюк раіў вучням куды пайсці вучыцца далей. Калі чарга падышла да Лены, ён насміхаючыся сказаў: „табе, Ленка, трэба далей ісці вучыцца да Нуты на агарод, буракі палоць". Настаўнік не памыліўся. За 15 кап. у дзень пашла 13-гадовая Лена працаваць да агародніка.

Агафія Владзіміраўна.

У 16 гадоў выдалі замуж. Зноў не павязло. Пры крушэнні поезда ў 1921 годзе загінуў муж—рабочы-чыгуначнік. Засталася Лена з двумя маленькімі дзецьмі, 110-гадовым свёкрам і старухай маткай.

— Як жыць? Як выхаваць дзяцей?—Неадчэпна дакучала думка. На дапамогу прышоў калектыў чыгуначнікаў станцыі Калінкавічы (дзе раней працаваў муж). Лену прынялі ў дэпо чорнарабочай.

— Якая я была спачатку несвядомая,—гаворыць Елена Нікалаеўна. — У саюз баялася паступіць. Зараз аб гэтым непрыемна нават ўспамінаць.

У 1926 годзе тав. Міцько ўступіла ў партыю. З гэтага часу яна настойліва ўзялася за вучобу і грамадскую работу. Скончыла вячэрнюю школу для дарослых. У 1928 годзе Гомельскі Ўчпрафсож, дзе Елена Нікалаеўна працавала вылучэнкай на прафработе, накіраваў яе на гадзічныя тэхнічныя курсы. Правучылася год, і тут на яе шчасце па пастанове ўрада курсы рэарганізавалі ў транспартны інстытут. Праз два гады былая чорнарабочая—Елена Нікалаўна прыехала ў Гомель чырвоным інжынерам.

* * *

У росце тав. Міцько не малую заслугу мае і яе маці Агаф'я Владзіміраўна. Рана аўдавела яна. Начамі мыла бялізну, у дзень працавала ў людзей на полі, і ўсё для дзяцей.

З сям'ёй Лены Агаф'я Владзіміраўна неразлучна. Гэта яна выхавала ўнукаў Колю і Шуру. Гэта яна засталася з імі адна на тры гады і ўгаварыла сваю дачку паехаць у інстытут.

Недарма 19-гадовы Коля (студэнт Віцебскага мастацкага тэхнікума) піша малодшаму брату: „Дарагі Шурык! слухай нашу самую родную і залатую бабульку".

На кватэры т. Міцько ў кутку

Тав. Міцько.

стаіць кухонны столік, збіты яе мужам з дрэнна абцёсаных дошчак. Гэты столік быў калісці адзінай мэбляй Міцьковых.

— Для калекцыі пакінулі яго,— гаворыць Шура.

І сапраўды толькі для калекцыі.

У Елены Нікалаеўны ёсць зараз нікеляваны ложак, ёсць дыванчык, добрая шафа, фікусы, пальмы, чатырохлампавае радыё, электрычнасць. Малюнкі, зробленыя сваім мастаком Коляй, упрыгожваюць сцены ўтульнай кватэры.

* * *

Гаворачы аб Міцько, нельга не папракнуць кіраўніцтва Гомельскага чыгуначнага вузла, у прыватнасці начальніка т. **Фокіна**. Ён відавочна забыў, што Елена Нікалаеўна інжынер і што яе даўно трэба вылучыць на больш адказную работу па спецыяльнасці.

Трэба запомніць каштоўнейшыя слова наркома Л. М. Кагановіча: „Людзі ў нас ёсць і надзвычайныя людзі... Трэба толькі ўмець іх вылучаць і навучаць".

Гомель. **Шыфрына.**

НА ЎСЁ ХАПАЕ ЧАСУ

Яна працуе на Менскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча брусаўшчыцай у закройным цэху.

Тав. **Стронгіну** ведаюць усе. Яе ведаюць як добрую ўдарніцу-зотаўку, грамадскую працаўніцу, ударніцу вучобы і як лепшую маці—па комуністычнаму выхаванню дзяцей.

Пяць гадоў таму назад, калі тав. Стронгіна прышла на фабрыку, яе неяк не заўважалі. Сядзіць яна, бывала, ціханька і працуе. Сляды толькі што перанесенага гора (смерць мужа—рабочага гэтай-жа фабрыкі) былі бачны на яе твары. Было сапраўды цяжка: адна, двое дзяцей.

Абстаноўка, людзі, работа—усё гэта новае.

Але так працягвалася не доўга. Характар ужо ў яе такі, ды і калектыў дапамог ёй асвоіцца ў новым асяроддзі. Павесялела, энергічна ўзялася за работу.

Хутка яе перавялі на больш кваліфікаваную работу — брусоўку верхняга края. Павысіўся зразумела і разрад. І тут жаданне працаваць добра дапамагло ёй хутка асвоіць працэс работы. Яна вывучыла машыну і пачала даваць добрую якасць прадукцыі. Адна з першых па цэху здала яна соцтэхэкзамен на „выдатна".

Ударніца Стронгіна ўмела сумяшчае добрую работу ў цэху з вучобай па ліквідацыі сваёй малаграматнасці, з грамадскай работай у школе, дзе вучацца яе дзеці.

Стронгіна акуратна сочыць за вучобай дзяцей, правярае іх дома і часта наведвае іх у школе.

Яна знаходзіць час і для хатняй работы. У яе кватэры (два пакоя і кухня) заўсёды чыста. Не гледзячы на тое, што яна толькі адна працуе, яе дзеці не адчуваюць недастатку.

— Трэба што-небудзь дзецям, я тут-жа ў дзень палучкі купляю ім, а там як-небудзь абыйдуся. Таму яны ў мяне заўсёды апрануты чыста і абуты.

Дзеці Стронгінай маюць асобны куток, пакой для заняткаў. Дачцы Соні—15 год. Яна ўжо перайшла ў 9 клас. Вучыцца добра і дапамагае матцы ў вучобе. Сын Вова—13 год, перайшоў у шосты клас, вучыцца на „выдатна". Вова добра капіруе партрэты правадыроў і навучыўся нават маляваць людзей з натуры—яму так даўно хацелася дасягнуць гэтага.

У вольны час ад заняткаў уся сям'я чытае разам. Існуе ў іх такое правіла—раз у пяцідзёнку Соня бывае ў кіно. Вова бывае радзей, „таму што ён маладзейшы",—растлумачвае маці.

І з Соняй і з Вовай можна размаўляць, як з дарослымі на любыя тэмы. Іх вытрымка, уменне трымаць сябе, тактычнасць—проста здзіўляюць. Недарма-ж тав. Стронгіна на трэцяй гарадской канферэнцыі бацькоў і педагогаў за добрае выхаванне дзяцей у комуністычным духу атрымала прэмію—150 руб.

За лета дзеці добра адпачылі і паправіліся: Соня—на санаторнай пляцоўцы, Вова—у санаторыі і ў піонерскіх лагерах. Маці таксама была ў доме адпачынку.

— Я і не марыла, што буду так жыць, што буду граматнай, што дзеці мае будуць расці людзьмі, сапраўды патрэбнымі нашай краіне.

— Але гэта не мара—гэта сапраўднасць. Усякая, здавалася, нязбытная мара, у нас, у краіне соцыялізма, робіцца сапраўднасцю.

Так канчае расказ аб сабе тав. Стронгіна.

Буніна.



Тав. **Стронгіна** з сваімі дзецьмі.

АБ ЛЮДЗЯХ ЗАБЫЛІ

На чашніцкай папяровай фабрыцы „Чырвоная зорка“ працуе 600 работніц. Большасць—моладзь, нядаўна прышоўшая з вёскі. Гэта абавязвае фабрычныя арганізацыі правесці дыферэнцыраваную масавую работу непасрэдна ў цэху, каб уцягнуць работніц у культурнае жыццё і вучобу, удзяліць больш ўвагі вырашчванню людзей, вылучэнню лепшых работніц на кваліфікаваную работу.

Праўда, за апошнія пяць месяцаў новае кіраўніцтва фабрыкі занялося пытаннем прасоўвання работніц на больш высокія кваліфікацыі. На разныя вядучыя прафэсіі вылучана 6 жанчын, з іх старшымі рольшчыкамі—3. Але гэта толькі першыя крокі. Ёсць многа старых, здольных работніц, аб якіх забылі.

Ксеня **Падрэз**—кваліфікаваная сартыроўшчыца. 12 год працуе на фабрыцы. У 1932 годзе яна была вылучана ў сталоўку кантролем, а потым — буфетчыцай. У 1934 годзе без усялякіх прычын знялі яе з гэтай работы і зноў перакінулі ў паккамеру сартыроўшчыцай.

Чатыры месяцы таму назад Ксеню накіравалі ў якасці брыгадзіра па сартыроўцы макулатуры. Тры месяцы працавала яна. А цяпер па загаду завода-кіраўніцтва брыгадзіры сумяшчаюць гэту работу з падачай макулатуры. Ці рацыянальна кваліфікаваную работніцу трымаць на такой рабоце? Ці не лепш было-б вылучыць яе на работу па яе спецыяльнасці?

Аб работніцах наогул на „Чырвонай зорцы“ забываюць. У клубе вісіць дошка ўдарнікаў. На ёй няма ні адной работніцы. Між іншым на фабрыцы многа перадавых ударніц. Возьмем напрыклад, **Клёц** Дар'ю—старшага рэзчыка трэцяй папяровай машыны. Гэта энергічная здольная дзяўчына прафорг, лепшая ўдарніца. **Александровіч** Анастасія—старшы рольшчык. **Азаронак Ганна**—брыгадзір паккамеры і рад іншых.

Ёсць многа фактаў нячулых адносін к старым работніцам-ударніцам. **Касцюкоўская** Марына працуе 8 год на фабрыцы. Па становішчу здароўя ёй неабходна падымацца на высокі паверх, а між іншым яна жыве ў інтэрнаце на трэцім паверсе. Не аднаразова **Касцюкоўская** прасіла фабком перавесці яе ўніз, але старшыню фабкома тав. **Жуковіча** гэта мала турбуе.

Другі факт—**Уральская** Патрунеля працуе 14 год на фабрыцы. Яна адчувае патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні, бо лёгкія яе хворыя. Кватэра тав. **Уральскай** вільготная, што ўплывае на яе здароўе. Аднак Уральская не была накіравана на лячэнне.

Культурна - масавая работа—у загоне. Па падлікам фабкома на першае мая на фабрыцы было 41 няграматных і 37 малаграматных жанчын. Гэта—агідная лічба.

Тэхнічная вучоба таксама праводзіцца ненармальна. Ёсць многа фактаў, калі пачыналі вучобу, а экзамены не былі праведзены (у рольным цэху, на рэзках).

Увечары ў клубе рэдка ўбачыш работніцу, бо там нічога цікавага няма.

Работа сярод дзяўчат ўскладваецца на комсамольскую арганізацыю, але на фабрыцы ўжо больш года комсамольскага схода не было. Няма вучота комсамольцаў. Адным словам комсамольскай арганізацыі тут не адчуваюць.

Інтэрнат падобен на казарму старога часу. На ложках няма прасцін, на сценах—ні аднаго партрэта правадыра. Не бачна ні адной кветкі. Затое клапоў хапае.

Ніякай культурнай работы няма ў інтарнаце. Не бачна ні газеты, ні кніжкі. Не дзіўна таму, што ў адной работніцы знайшлі буржуазныя журналы з 1901 года, якія яна выцягнула з макулатуры. Вось што чытаюць ў інтэрнаце па вечарах. Гэта недапушчальнае з'явішча.

Новае кіраўніцтва фабрыкі змагло па-большэвіцкі наладзіць работу на вытворчасці. Фабрыка вышла з прарыва, сістэматычна выконвае прамфінплан. Гэта-ж кіраўніцтва павінна ліквідаваць і прарыў у культурна-масавай рабоце і вырашчванні кадраў з лепшых работніц.

Е. Э.

ВЕЧАРЫ ПРАХОДЗЯЦЬ СУМНА

На фабрыцы „Чырвоная зорка“ я працую 13 год у якасці сартыроўшчыцы ў паккамеры.

У мінулым годзе мне вылучылі брыгадзірам першай змены паккамеры. З работай спраўляюся. Працуем дружна, увесь час выконваем прамфінплан.

Работаю над сабой. Чытаю газеты—цэнтральную і раённую, бяру кніжкі ў бібліятэцы. Нядаўна прачытала „Разгром“ Фадзеева. Вельмі спадабалася мне.

Адно дрэнна ў нас—не арганізован культурны адпачынак. Увечары сумна. У клубе нічога цікавага няма. Гульня у шашкі і японскі більярд ужо прыелася. А культурныя вечары з цікавымі гутаркамі—у нас рэдкасць.

Цяпер мы заканчваем будаўніцтва новага клуба. Спадзяемся, што гэта дасць магчымасць больш разгарнуць культурна-масавую работу.

Чашнікі. **Азаронак Ганна.**

ХАЧУ ПАВЫСІЦЬ СВАЮ КВАЛІФІКАЦЫЮ

У маі гэтага года мяне вылучылі старшым рольшчыкам першай папяровай машыны. З ахвотай узялася я за гэту работу, але ўсё-ж спачатку было неяк страшнавата. Здавалася, што не хутка асвою гэту кваліфікацыю, падрыхтую недобраякасную масу, з-за мяне машына стане, можа быць і брак.

Прайшоў некаторы час і я перамагла ўсе цяжкасці. Уцягнулася ў работу і, па праўдзе кажучы, працую не горш старых рабочых. Даю масу нядрэннай якасці. Ніколі з-за мяне не было зрываў і астаноўкі машыны. План выконваю на 100—105 проц.

Хачу павысіць сваю кваліфікацыю, вучыцца, бо не вельмі граматная я. Але тэхнічная і агульная вучоба ў нас дрэнна арганізавана. Займаліся мы па тэхмінімуму, але не скончылі вучобу. Так і не здала я тэхэкзамена.

Навучальны год пачынаецца, а ў нас нешта не чуваць, якія формы вучобы будуць арганізаваны. Ці будуць школы прыстасаваны да змен

Дрэнна, што ў нас няма ніякай работы сярод моладзі. Комсамольская арганізацыя зусім не працуе.

Чашнікі, папяровая фабрыка „Чырвоная зорка“. **Яцук Хрысціна.**

Жаночая спартакіяда

30-га жніўня. Гэта быў надзвычайны дзень. Сонца ярка свяціла і прымушала яшчэ шырэй усміхацца маладыя жаночыя твары.

42 дзяўчыны сабраліся на стадыёне, на першую жаночую спартакіяду профсаюзаў па лёгкай атлетыцы.

Тут былі фізкультурнікі лесазавода Белдрэва, хлебазавода, будаўнікі і іншыя.

Радасна, але напружана праходзіла спаборніцтва.

Першынства заняла каманда „Спартак". Работніца **Зелянкевіч** вышла першай па бегу на 500 метраў. Яе паказчыкі—1 мінута 44 секунды.

Другое месца заваявалі дзяўчаты лесазавода Белдрэва. На 30 метраў 22 сант. мятнула гранату **Броніна Шура.** Выдатна паказала яна сябе і пры таўканні ядра. А **Аўласенка Оля** заслужыла другое месца па бегу на 500 метраў.

Трэцяе месца на спартакіядзе заняла каманда хлебазавода. Асабліва прыгожы быў прыжок **Шалаевай Марусі** на 1 метр 9 сант. у вышыню.

З каманды будаўнікоў вызначылася **Маркман Ліза.** Яна ўдзельнічала ў розных відах спартакіяды. Па прыжках у даўжыню—3 метра 60 сант.—яна заняла першае месца, а дыск мятнула на 21 метр 75 сант.

У заключэнне спартакіяды была праведзена эстафета 4×100. Першае месца тут занялі будаўнікі, а другое лесазавод.

А. Мацылевіч.

Полацк.

Броніна Шура таўкае ядро.

На старце.

Злева-направа Нефанцева Зіна і Маркман Ліза.

Маладзёжная лента

Бязрадасна жыве рабочая моладзь у капіталістычных краінах. Яе рабочы дзень павялічваюць, зніжаюць заработную плату. Яна адчувае на сабе жудасць беспрацоўя і голад. Толькі ў нас, у краіне Советаў, моладзь шчаслівая. Толькі ў нас моладзь радасна і бадзёра жыве, працуе і вучыцца.

У нас у цэху ёсць маладзёжная лента. У ёй працуе 20 дзяўчат. Гэта фізічна моцныя і жыццярадасныя дзяўчаты. Моцныя яны таму, што не адчуваюць на сабе капіталістычнай эксплаатацыі, таму што адчуваюць сябе, як і старыя нашы рабочыя, гаспадарамі фабрыкі.

Рабочы дзень на ленце—шасцігадзінны. Працуюць дзяўчаты прадукцыйна. Вытворчы план заўсёды выконваецца на 104—105 проц. Сістэматычна павышаецца наша кваліфікацыя. З 20 дзяўчат—17 здалі тэхэкзамен на „выдатна". Гэта дало свае вынікі. Да міжнароднага юнацкага дня 13 дзяўчатам нашай змены павысілі разрады.

Падростак **Гурвіч** пераведзена з падсобнай работы, дзе яна атрымлівала другі разрад, на кваліфікаваную работу, на чацверты разрад. **Котава, Багданава** і другія з 3-га разрада пераведзены на чацверты.

Уся наша моладзь вучыцца: большасць на вячэрнім рабфаку, а астатнія—у фабрычнай школе рабочай моладзі і палітшколе. Падрыхтоўваем мы моладзь для ўступлення ў комсамол. 20 беспартыйных дзяўчат вучацца ў гуртку па вывучэнню ўстава і праграмы ВЛКСМ.

Парторг нашага цэха тав. **Пэўзнер** штодзённа цікавіцца комсамольскай работай. Яна дапамагае мне ў складанні планаў работы, праводзіць гуткі з моладдзю і г. д. Адно дрэнна. Нагрузкі ў нас размяркоўваюцца нераўнамерна. Вось я—комсорг, член комсамольскага камітэта і старшыня бюро фізкультуры. Справіцца з усімі нагрузкамі мне цяжка. Між тым ёсць у нас комсамольцы без нагрузак.

Клаз.

Магілеў, швейная фабрыка імя Валадарскага.

ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

У № 15 журнала быў змешчан матэрыял як комсамольская лента фабрыкі „Окцябр“ унядрае вопыт менжынцаў у сваёй брыгадзе. Цяпер мы можам падвесці вынікі за тры месяцы работы па гэтаму метаду.

Дабіліся мы значных дасягненняў. На многа палепшылася якасць пашыву. Калі паглядзець пальто ў гатовым выглядзе, то яно не ўступае сшытаму па індывідуальнаму заказу. Пераробкі бываюць нязначныя. Калі раней брыгада мела па 20—25 пераробак, то зараз маем 5—8 пераробак. Дабіліся таксама зніжэння процанта брака.

Для большай нагляднасці прывядзем некаторыя лічбы. У ліпені на „выдатна“ прынята 12,4 проц., на „добра“—84,3 проц. і на „здавальняюча“—3,3 проц. прадукцыі. У жніўні на „выдатна“ было 16,8 проц., на „добра“—79,4, і „здавальняюча“—3,8 проц.

Наша брыгада цяпер не ведае актаў з базы Швейзбыта, а ранней мы мелі па два—тры акта. Значна палепшылі сваю работу рабочыя **Парэнчык, Плаксіна, Зінкевіч**. Выраслі новыя выдатнікі: **Кац, Богамолава, Грап, Свершчук, Сельц.** З першага верасня для рабочых, працуючых на „выдатна“, уведзены прэміі. Гэта дае стымул працаваць яшчэ лепш і дабівацца яшчэ больш выдатных балаў.

Недахопам я лічу тое, што выдатнікамі займаюцца толькі майстар і начальнік цэха. Партыйная і прафесіянальная арганізацыі стаяць у баку. Фабрычная шматтыражка і брыгадныя штодзёнкі павінны больш асвятляць работу выдатнікаў. Трэба на змена-сустрэчных, альбо брыгадных сходах кожную пяцідзёнку даводзіць да рабочага аб выніках яго работы.

Не гледзячы на гэтыя недахопы, можна смела сказаць, што вопыт менжынцаў даў шмат карысці нашай брыгадзе.

Вербіцкая.

Менск.

ПАСЛЯ ГАРАЧЫХ ПРАМОЎ

На канферэнцыі жаночай моладзі ў нас на заводзе многа гаварылі аб падняцці кваліфікацыі сярод дзяўчат і палепшанні іх бытавых умоў. Прамовы былі гарачыя. І рэзалюцыя прынята даволі вялікая.

Пасля канферэнцыі прайшло больш месяца. Даўно трэба было прыступіць да выканання пастановы ў жыццё. На жаль, гэтага няма.

Вось факты. У 1932 годзе я скончыла фабзавуч. З таго часу працую па другому разраду. Начальнік цэха тав. **Леўшукоў** хваліць мяне за работу і гаворыць, што я заслугоўваю павышэння разрада. Усё-ж разрад не павышаюць.

Не толькі я адна ў такім становішчы. Комсамолка **Сізая** скончыла фабзавуч яшчэ раней за мяне і таксама сядзіць на другім разрадзе.

Цяпер аб бытавых умовах. У нас у цэху я і **Советкіна**—былыя выхаванкі дзіцячага дома. Увесь час жывем у цяжкіх кватэрных умовах. Аб гэтым не раз таксама гаварылася на сходах і на пасяджанні комсамольскага камітэта. Рашылі даць нам пакой у доме комуны. І гэта пастанова засталася на паперы.

Пара комсамольскаму камітэту сапраўды падумаць аб сваіх комсамолках.

Карасневіч.

Гомель. завод імя Ланцуцкага.

ВОСТРАЕ ПЫТАННЕ

Часта прыгадваецца старое і мой прыезд у Расію з Латвіі ў час імперыялістычнай вайны ў 1916 годзе. Цяжкія часы былі. Забітасць і несвядомасць душылі нас.

Толькі з моманту Окцябрскай рэволюцыі, калі я паступіла на работу ў палявую этапную ваенную хлебапякарню, я адчула сябе сапраўды чалавекам.

На гэтай хлебапякарні я ўпершыню была абрана ў фабком. Свядомасць мая ўзрастала. У 1918 годзе я ўступіла ў партыю.

Мовы рускай не ведала, ды і зараз я не зусім граматная. Так ўжо атрымалася ў мяне. Увесь час працую на адказных участках, увесь час пераброскі з аднаго месца на другое.

Думка аб маей няграматнасці зараз мне асабліва цяжка. Уся партыя на чале з таварышам Сталіным патрабуе ад нас сістэматычнай работы над сабой, хутчэйшай ліквідацыі партыйнай і агульнай малаграматнасці. І тут узнікае пытанне, як здолею я ліквідаваць сваю малаграматнасць, калі на працягу года мяне перадкідваюць некалькі разоў з адной работы на другую.

Адам-Кавалеўская.

Віцебск, фабрыка „КІМ“

Заняткі на рытміцы ў Віцебскім доме мастацкага выхавання дзяцей.

Аб нашым „вылучэнні“

Мне 50 гадоў, з іх 38 работаю на Добрушскай папяровай фабрыцы. З 1918 года прымаю актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Была першай жаночай дэлегаткай на фабрыцы. Да рэволюцыі за актыўны ўдзел у забастоўцы была на год зволена з работы. Чаму я аб гэтым пішу? Толькі таму, каб даказаць, як нячула падышлі да мяне зараз нашы фабрычныя арганізацыі.

У 1929 годзе выклікалі мяне ў фабком і сказалі: „Хопіць, Фёкла, работаць ля станка. Вылучаем цябе на адказную работу“.

Праз некалькі дзён была я абрана старшынёй цэхавага камітэта. Тры гады праработала на гэтай рабоце. Пасля была майстрам цэха і старшынёй рабочкома прыгараднай гаспадаркі. Некалькі раз была прэміравана.

Потым мяне паслалі загадчыцай дзіцячага ачага № 2. Прыняла ачаг у дрэнным становішчы. Але хутка стаў ён непазнавальным. Ліквідавалі запазычанасць, зрабілі рамонт і палепшылі харчаванне. Праз некаторы час ачаг пастанавілі аб'яднаць з другім фабрычным ачагом.

Тут і пачаліся мае пакуты. Загадчыцы ачага № 1 **Асмалоўскай** я нешта не спадабалася. Можа таму, што фабком прапанаваў мне прыняць усю гаспадарчую работу? Яна рашыла выжыць мяне з ачага. Справу гэту разбіраў партком і прызнаў, што тут наглядаецца падсіджванне з боку **Асмалоўскай**. Аднак гэта не перашкодзіла ёй праз РайАНА дабіцца аслабанення мяне з работы.

Пяць месяцаў прайшло з тых пор, як я звярнулася зноў на фабрыку. Сталай работы яшчэ не маю: то замяняю аднаго брыгадзіра, то другога. Такое становішча на фабрыцы лічу не заслужаным. Пры тым пастрадала я значна ў зарплаце: замест 200 р. у месяц, якія раней атрымлівала, я маю цяпер 120—130.

Васіленкава Фёкла.

***

Хачу расказаць пра сваё вылучэнне. У 1931 годзе партыйныя і фабрычныя арганізацыі вылучылі мяне на работу ў вёску. Работала ў Церахаўскім раёне, у калгасе імя Калініна загадчыцай малочна-таварнай і свінаводчай фермы. Не буду хваліцца, але работала не дрэнна. Калгас за фермы атрымаў не адну прэмію. Ды і я за два гады была тры разы прэміравана Райком партыі адазваў мяне з калгаса і вызначыў інструктарам трусаводных і птушкаводных ферм. Адтуль паехала ў цэнтральную калгасную школу. Па сканчэнні яе была прызнана загадчыкам Райжывёлаб'яднання ў Церахоўскім раёне. Але гэта пасада хутка была ліквідавана. Тады я папрасіла райком, каб мяне адпусцілі ў Добруш, дзе я думала работаць па сваёй спецыяльнасці на фабрычнай ферме.

Прыехала ў Добруш. На ферму мяне не паслалі, а вызначылі загадчыкам сталоўкі на будаўніцтве. Праработала там усяго чатыры месяцы. Ні партком, ні іншыя фабрычныя арганізацыі мне работаць не дапамаглі. Нават ні разу не заслухалі маёй справаздачы. Людзям, якія раней разбазарвалі прадукты ў сталоўцы, мая работа не спадабалася. І начальнік будаўніцтва Шолакаў з работы мяне зняў.

Пасля гэтага пайшла я на старае месца ў паккамерны цэх, дзе работала з 1899 года. Цяпер з'яўляюся брыгадзірам па клейцы сшыткаў. Не задавальняе мяне гэта. Дзяржава патраціла шмат грошай на маё навучанне. Я атрымала кваліфікацыю па жывёлагадоўлі. Няўжо нельга мяне скарыстаць па спецыяльнасці? Адчуваю, што пры належнай дапамозе я-б упаўне справілася з работай.

Цубрыкава Алімпіяда.

Добруш.

ЧЫМ ЗАНЯТ ФАБКОМ?

На запытанне, які ўдзел прымаюць работніцы ў клубнай рабоце, загадчык клуба тав. **Власенка** адказаў адным словам: „Недастатковы“. Гэты адказ быў ім падмацован такімі дапаўненнямі: у мастацкім гуртку жанчын зусім няма. У драмгуртку—чалавек пяць. Гурток кройкі і шыцця трэба было арганізаваць, але ніяк не адрамантуем швейныя машыны. Стала яскрава, што ў клубную работу работніцы не ўцягнуты.

Аб тым, наколькі вялікая цяга да гурткоў самадзейнасці, сведчыць такі факт. У паккамерным цэху, па ініцыятыве настаўніцы тав. **Вольскай**, арганізаваўся харавы гурток. 40 работніц (многім з іх ужо па 40—45 гадоў) з задавальненнем спяваюць у гуртку. Нават гэта ініцыятыва работніц не падхоплена клубнымі работнікамі. Гурток не мае сталага кіраўніка і збіраецца ад свята да свята.

Няма чым пахваліцца парткому і фабкому ў пастаноўцы культмасавай работы. Возьмем паккамерны цэх. У ім работае больш 500 работніц. Большасць з іх з вялікім вытворчым стажам. Але многія зусім малаграматныя. У школах вучацца толькі 33 чавека.

У цэху быў арганізован гурток па бягучай палітыцы. Але кіраўнік яго тав. **Максачоў** пашоў у адпачынак, а другога партком не вылучыў.

Як гэта ні дзіўна, але на Добрушскай фабрыцы ў многіх работніц у хатах вісяць іконы. Класавы вораг працуе на гэтым фронце, не пакладаючы рук. Аднак фабрычныя арганізацыі гэта не турбуе. Ніякай антырэлігійнай праганды сярод работніц не вядзецца. Толькі перад вялікаднем, альбо другім рэлігійным святам правядуць гутарку і ўсё.

Можна падумаць, што ў фабкоме няма работнікаў. Не, гэтага нельга сказаць. Ёсць старшыня, ёсць і намеснік, ёсць і яшчэ аслабанёныя работнікі. Яны лічуць сябе вельмі занятымі і на культмасавую работу не знаходзяць часу.

М. Ш.

НА МАСОЎЦЫ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Тысячы чыгуначнікаў Менска сабраліся ў выходны дзень у сад „Профінтэрн“ на масоўку, прысвечаную выкананню наказа тав. СТАЛІНА— грузіць штодзённа 80 тысяч вагонаў.

Сад быў упрыгожан партрэтамі правадыроў, лозунгамі і чырвонымі сцяжкамі. Дэлегацыі буйнейшых прадпрыемстваў Менска запоўнілі ўсе алеі. Безліч моладзі і дзяцей. У розных канцах сада ігралі аркестры, арганізаваны былі масавыя гульні, танцы. Сцэна летняй эстрады сада ўпрыгожана была партрэтамі тав. Сталіна, Кагановіча і сцягамі.

Пасля мітынга роўна а 6 гадзіне пачалася трансляцыя з Масквы прамовы жалезнага наркома транспарта тав. Кагановіча. Паўтары гадзіны 15-тысячная маса людзей уважліва слухала прамову наркома.

Па сканчэнні ўрачыстасцей пачалася мастацкая частка. Менскі радыёцэнтр арганізаваў вялікі інтэрнацыянальны канцэрт, пасля якога разгарнулася самадзейнасць.

Тут-жа ў садзе былі арганізаваны кіносеансы.

В. Грынтфест.

Брыгада комсамольскага поезда.

НАША РАБОТА СЯРОД ДЗЯЎЧАТ

Пастанова ЦК ВЛКСМ аб рабоце сярод жаночай моладзі прымусіла нас звярнуць асаблівую ўвагу на ўсе недахопы, якія маюцца ў кожнай комсамольскай арганізацыі, у кожнай комсамольскай групе ў гэтай галіне.

К вылучэнню, к вырашчванню жаночых кадраў мы падышлі шчыльна. Зразумела, зробленае намі—гэта толькі пачатак, але ўжо сёння мы маем такіх комсамолак, як **Ядзя Галяшэвіч**, якой ганарыцца ўвесь калектыў нашага завода.

Папрацавала Галяшэвіч токарам у нас два гады. Пяць разоў за гэты час была прэміравана, а з 1 верасня вылучана на кіруючую работу ў цэху. Планавіком работае яна цяпер.

Ядзя Галяшэвіч не толькі работніца-ўдарніца, але і добры таварыш. Свае комсамольскія нагрузкі яна выконвае ўважліва і чотка. Комсорг комсамольскай ударнай змены, комсорг цэха і член комсамольскага камітэта—Ядзя заўсёды на вышыні. Кожны знаходзіць у яе заўсёды патрэбнае растлумачэнне і таварыскую падтрымку.

Часта прыходзіць Ядзя ў комсамольскі камітэт параіцца аб метадах работы, аб тым як ўвязаць ударніцтва на вытворчасці, актыўнасць па комсамольскай лініі і прыкладную вучобу. Рабфак Галяшэвіч скончыла з вельмі добрымі паказчыкамі, а цяпер яна займаецца ў школе па вывучэнню гісторыі партыі. Паспяхова здала яна і ваенна-тэхнічны экзамен.

Добра працуе і **Кунашкевіч Вера**. Пяць год таму назад прышла яна на завод столярам. Праз некаторы час яе як лепшую ўдарніцу вылучылі нарміроўшчыцай. Потым—вучоба без адрыву ад вытворчасці і цяпер Вера—эканаміст па працы на заводзе. Добра ідзе ў яе і палітвучоба. Адзнакі „здавальняюча“ не ведае Вера. Толькі „добра“ і „выдатна“ атрымоўвае яна. Акрамя таго яна актыўная работніца Асоавіяхіма і вельмі добры стралок.

Есць у нас і другая дзяўчына стралок—вядомы на ўсёй чыгуначнай лініі Менск—Хабараўск. Гэта **Ліда Добрагост**—былы слесар, а цяпер загадчыца складам. Наша Ліда атрымала першынства на спаборніцтве нашай дарогі.

Ганарымся мы і слесарам **Маняй Голуб**—гэта лепшая заводская планерыстка і парашутыстка.

Уважліва мы сочым і за ростам **Тамары Бязручка**. Была яна столярам, а цяпер—нарміроўшчыца.

Такіх актыўных, растучых дзяўчат у нас не мала. Мы стараемся дапамагаць ім у рабоце, вучобе, у наладжванні культурнага здаровага быту. Уперадзе ў нас яшчэ непачаты край работы. Мы прыкладваем усе сілы, каб узняць актыўнасць нашых дзяўчат, вылучаць іх і накіроўваць кожную па правільнаму шляху, улічваючы яе здольнасці і нахілы.

Хасін.

Сакратар комсамольскага камітэта. Менскага вагонна-рамонтнага завода імя Мяснікова.

Злева направа: Голуб Маня—слесар, планерыстка, Сурко Вера—планавік, Бязручка Тамара—нарміроўшчык, Кунашкевіч Вера—эканаміст. Зверху: Добрагост Ліда—лепшы стралок на МББ.

Сонечнае племя

Уся краіна ў гэты дзень праводзіла іх у школу. Уся краіна, як клапатлівая родная маці, рыхтавала ім утульнасць, абкружала іх увагай і любоўю. Уся краіна адчыняла ім дзверы вучобы.

Яснай вераснёўскай раніцай, сонечнай, як яны самі, памацнеўшыя, загарэлыя за летнія месяцы, праведзеныя ў сасновых лясах, яны тысячнымі масамі накіраваліся ў прывабныя карпусы школ.

Класныя памяшканні раптам загулі, ажывіліся, напоўніліся вясёлым шумам і смехам звонкіх галасоў. Так было раніцою ў першы дзень вучобы. Але вось празвінеў званок і напружаная цішыня, як напятыя струны, павісла ў паветры.

Маладосць увайшла ў класы, маладосць заняла месцы за партай, маладосць прыкавала сваю ўвагу да голаса настаўніка, каб выканаць неўміручы ленінскі завет: „вучыцца, вучыцца і вучыцца".

* * *

Маці ідзе з дзіцёнкам. Клапатліва прапускае яна яго наперад. На яе вуснах гордая ўсмешка.

Але чаму раптам спахмурнеў яе твар? Чаму так засумавалі вочы?..

Яна ўспомніла аб сваім першым наведванні школы.

Сутарэнне. Бацька—шавец. Вялікая сям'я. Галодныя дні... Дзеці з вышэйшых паверхаў натоўпам накіроўваліся ў школу. Некаторых адвозілі нават. Зайздросна было, цяжка. Струменем цяклі горкія слёзы...

Але вось на момант шчасце ўсміхнулася і ёй.. Бацька павёў яе ў школу. Пужліва прытуліўшыся да сценкі яна недаверліва паглядала і на швейцара з суровымі вачыма і густой барадой, на настаўнікаў у мундзірах з цвёрдымі каўнерчыкамі і на гарэзны натоўп вучняў. І ўсё-ж, якое шчасце! Цяпер і яна раніцой будзе хадзіць у школу, увойдзе ў гэты новы, невядомы прывабны свет.

З габінета дырэктара вышаў паблядзелы бацька. Ён сагнуўся. Скамечаная шапка была заціснута ў правай руцэ. Бегла паглядзеў ён на дачку і рэзка кінуў:

— Хадзем, Нінка, не прымаюць. Грошы патрабуюць...

А зараз Ніна Александраўна Кастрова сама вядзе свайго сына ў новую, светлую школу.

* * *

Маленькі школьнік у шэрым касцюме выглядае дужа паважна.

Чаму такі горды Косценька Кастроў?

— Мама, паглядзі, які высокі дом! Якія вокны! Колькі ў ім радоў? Адзін, два, тры, чатыры.

— Не радоў, а паверхаў, сынок,—папраўляе маці.

Шырокія дзверы новай сталінскай школы гасцёўна адчынены. У калідоры група бацькоў. Дзеці ўжо разышліся па класам, а яны ўсё яшчэ не спяшаюцца выходзіць.

Малодзенькая жанчына з кароткa падстрыжанымі валасамі узнята гаворыць:

— Разумееце, у мінулым годзе мая Валя хадзіла ў школу на другі канец горада. А зараз, як добра. Школа зусім блізка.

— Ды яшчэ якая школа!—дадае другая.

— Сталінская! — адзываецца трэцяя.

Прасторныя класы, два-тры вялізных вакна у кожным. Ёсць месца для гульняў і для габінетаў.

Бацькі працягваюць гутарку:

— А колькі паветра!

— Я чытала, што ў адным толькі Менску 6 такіх новых школ, а ў Маскве, здаецца 80,— гаворыць высокая жанчына ў хусцінцы.

Твары мацярэй асветлены радасцю за сваіх дзяцей, якія атрымалі новыя школы—палацы. Хутка дзяцей апрануць у прыгожую форму.

Вось як будуць вучыцца дзеці — гордыя арленята соцыялістычнай краіны, атуленыя ўвагай партыі і рабочага класа.

* * *

Мы заходзім у клас. Тут займаецца першая група. Кожнаму з сядзячых за гэтымі нізкімі партамі не больш 8—9 год. У класе глыбокая цішыня і напружаная ўвага.

Чытае Зіна. Яна пераведзена з падрыхтоўчага класа. Чытае выразна і старанна, хаця кудзёркі назойліва лезуць у вочы.

— „Залатыя лісты. Надыходзіць восень. Лісты на дрэвах пачынаюць жаўцець".

Уважліва слухаюць яе дзеці, а Вера Нікалаеўна час ад часу папраўляе няправільныя націскі.

— Не спяшай, Зіна, паўтары. Вось цяпер добра.

Дзеці з гатоўнасцю выконваюць усе заўвагі настаўніцы.

— Карнейчык, дзе ты трымаеш кніжку, яна павінна быць на парце. Ну вось так, малайчына.—Дзеці, вам усё ясна з таго, што мы прачыталі? Паўтары, Ліда!

Дзяўчынка, якая сядзіць побач з кудравай Зінай, узнімаецца і голасна, без хвалявання паўтарае прачытанае.

Пачынаюцца запытанні:

Чаму лісты залоцяцца? Якая ў нас зараз пара году? Што робяць увосень у калгасе? На ўсе гэтыя запытанні дзеці даюць дакладныя адказы.

З уздымам прачыталі дзеці пявучы верш „Школьнік".

Любіць ён вучыцца, любіць і работаць,

Будзе з яго добры будаўнік—рабочы...

Простыя словы, але ў іх бліскучая ацэнка школьнікаў—сонечнага племені нашай краіны.

Е. Садоўскі.

АЧАГ КОМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

— Сёння знамянальны дзень, мы адчынілі семафор к стварэнню яшчэ большага шчасця дзецям нашай шчаслівай радзімы, — так казала загадчыца дзіцячага ачага запалкавай фабрыкі „X Окцябр“ тав. **Чауская**, ў дзень выпуска старэйшай групы дзяцей.

У дзіцячым ачагу—шэсць груп. 150 дзяцей выхоўвае **Чауская**—былая работніца клеельнага цэха. І вось сягоння свята. Сёння дзецям раздаюць падарункі.

Чауская пералоўнена радасцю, яна вырасціла моцных і разумных 30 жывых кветак.

Вось першая **Швыткова** Оля, яна бярэ сумачку для кніг, сшыткаў і алоўкаў і ляпеча:

— Дзякую. Я добра буду вучыцца.

Олечка добра малюе, у яе ўвесь сшытак замаляваны. На першай старонцы ў яе **Ленін**, а на другой—**Сталін** з подпісам—„лепшы друг дзяцей“.

А вось другая — **Левіна** Нэля. Гэта надзвычайны маленькі скульптар. У яе цэлая сям'я фігурак розных звяроў, і ўсе яны стаяць у рад, адна за другой.

Тут-жа і **Марчак** Нома—цудоўны дэкламатар. Ён дэкламуе вершы: „Ленін“, „У лагеры“, „Піонер“. За імі, паблісквачы вачыма, выходзяць на сцэну **Балеў** Сярожа і **Блюмін** Грыша—гэты дзіўны канструктар парашутаў. Яшчэ і яшчэ выходзяць маленькія пачынаючыя распускацца таланты. Іх вырасціла, як садоўнік вясновыя кветкі, Хана Чауская.

Партком фабрыкі адзначыў правільнае комуністычнае выхаванне дзяцей у ачагу тав. Чаускай. Так могуць выхоўваць дзяцей толькі людзі працы, ударнікі-выдатнікі.

Чауская працуе з малых год. Увесь яе шлях—гэта шлях сумленнай працы. Чатыры гады яна працавала хатняй працаўніцай у кулакоў і мяшчан горада Рэчыцы. Працавала ў больніцы сядзелкай. У 1925 годзе пачала працаваць на фабрыцы ў клеельным цаху. Яна добра засвоіла тэхніку сваёй работы і праз некаторы час зрабілася лепшай ударніцай - выдатніцай. Першай пачала яна працаваць на дзве машынкі.

Уларніца Чауская ўступае ў партыю. Яна пачынае працаваць не толькі на вытворчасці, але і на розных грамадскіх работах.

У 1930 годзе яе вылучаюць майстрам змены. Тут яна працуе яшчэ лепш. Праз некаторы час яе вылучаюць профоргам зборачнага цэха. Падзякі і прэміроўкі, якія яна атрымлівала на працягу сваёй работы, як нельга лепш характэрызуюць тав. Чаускую. Нарэшце—апошняя работа ў дзіцячым ачагу. І тут Хана справілася з вялікай справай, справай выхавання дзяцей у комуністычным духу. Усяго год працуе яна ў ачагу, але вынікі яе работы паказальны.

Большэвіцкае жаданне, любоў да справы, настойлівасць—вось характэрныя рысы работніцы—вылучэнкі Чаускай.

Такі слаўны шлях работніцы магчымы толькі ў краіне Саветаў.

Г. Новік.

Рэчыца.

ПАДРЫХТАВАЛІСЯ К ЗІМЕ

Яслі № 3 абслугоўваюць дзяцей работніц фабрыкі імя Кагановіча. Па Менску яны лічацца ўзорнымі.

Работа нашых яслей была адзначана ЦВК БССР. За ўзорныя паказальнікі яны былі занесены ў чырвоную кнігу імя XI Усебеларускага з'езда Саветаў.

Гэта пачэсная адзнака ўскладала на нас яшчэ больш адказнасці ў пастаноўцы выхаваўчай работы і харчавання, каб яслі сапраўды былі ачагом, дзе дзіця адчувае сябе лепш, чым дома—у мацеры.

Адным з важных момантаў у нашай рабоце мы лічым—фізічнае ўмацаванне дзяцей. Вопыт паказаў нам, якую ролю грае летняя аздаравіцельная кампанія ва ўмацаванні арганізма дзіцяці.

У гэтым годзе асабліва добра прайшла кампанія. Ужо шосты год нашы яслі выязджаюць на дачу за чатыры кілометра ад горада ў сасновы лес, у калгас „Перамога“.

72 дзяцей мы вывезлі на дачу. 15 з іх было малышоў, толькі пачынаючых хадзіць. За час прабывання на дачы дзеці акрэплі, пачалі хадзіць і гаварыць.

Цэлы дзень дзеці знаходзіліся на свежым паветры ў сасновым лесе, нават у дажджлівае і халоднае надвор'е яны, цёпла апранутыя, знаходзіліся на адкрытай верандзе.

Мы правялі аздаравіцельныя мерапрыемствы—душ, сонечныя і паветраныя ванны.

У дастаўцы прадуктаў не было перабояў. Заўсёды былі добраякасныя, смачныя і рознастайныя блюды. Дзякуючы гэтаму мы не мелі за летні час ні аднаго выпадку жалудачна-кішачнага захворвання.

Кармілі дзяцей пяць разоў у дзень. Ягады і свежую гародніну яны атрымоўвалі ў вялікай колькасці. Малышы фізічна акрэплі і прыбавіліся ў вазе ў сярэднім па 1 кгр. 100 грам. Некаторыя прыбавілі па два кгр.—гэта **Гольдзін** Лёва, **Цімкоў** Вова, **Шуктунская** Ліда і іншыя.

Дзеці развіліся і разумова. Яны азнаёміліся з прыродай—лесам, полем, лугам, стадам. Многа дала сустрэча нашых дзяцей з калгаснымі. Нашы дзеці прападнеслі калгасным цацкі, частавалі іх. Тыя з свайго боку прападнеслі яблыкі і кветкі.

Гэта пакінула ў малышоў моцнае ўражанне. Цяпер, калі яны бачаць фрукты, то кажуць:

— Гэта расце ў калгасным садзе.

За час прабывання на дачы мы ў горадзе зрабілі належны рамонт памяшкання. Паправілі ўсе печкі і пліту. Зрабілі цёплы душ і дзіцячую прыбіральню (гаршэчную). Ашклілі ўсе вокны.

Закупілі мы цёплыя рэчы на зіму—коўдры, нацельную бялізну, закупілі дровы, падрыхтавалі склеп для захавання фруктаў і гародніны.

З фруктаў ясельнага сада мы зрабілі варэнне і павідла. Паставілі на адкорм двух кабаноў.

Цяпер мы падрыхтавалі план педагагічнай работы на зімовы час.

Загадчыца яслямі
Рахіль Готліб.

Уся ўвага ільну

У былым маёнтку памешчыка Валадковіча, у гушчы зеляніны раскінуўся калгас „Палітаддзелец", Чашніцкага раёна.

Якая прыгожасць! Вялікі парк, а ў ім—алеі, бяседка, упрыгожаная хвойнымі дрэвамі. Паблізу вялікі фруктовы сад—на дрэвах чырвоныя, спелыя яблыкі і грушы.

Раней у гатым парку весялілася памешчыцкая зграя. Ці-ж мог тады марыць батрак, каб пагуляць у памешчыцкім парку? Не! Гэта багацце, створанае рукамі батракоў, для іх, сапраўдных гаспадароў, было недаступным.

А цяпер у гэтым парку весела, свабодна гуляюць калгаснікі. Яны жывуць радасным і заможным жыццём і ўпэўнена глядзяць ў сваю светлую будучыню.

Прыгожы, трохпавярховы каменны дом, які раней займаў толькі памешчык з сям'ёй, цяпер заселен калгаснікамі. Тут змяшчаецца і канцылярыя калгаса, клуб, яслі і дзіцячы сад.

Калгас „Палітаддзелец"—адзін з перадавых у раёне. Ён мае вялікую жывёлагадоўчую і свінаводчую фермы. Плошча пахатнай зямлі—358, саду—4 га.

На 20 жніўня калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па хлебапастаўкам, а сёння 8 верасня—з МТС па натураплаце.

Зараз усе сілы накіраваны на падʼём ільну са сцелішча.

— Ільну мы цяпер аддаем ўсю ўвагу—кажа старшыня калгаса т. **Унуковіч,**—усе меры мы прымаем, каб наш лён быў добрачкасны.

* * *

На лугу, абкружаны лесам, рэдкімі радамі разасланы лён. Лёгкі вецярок калыша галіны дрэў і пракатваецца па ільняным сцяблам.

Пільна сачаць брыгадзіры за тым, каб лён добра выляжаўся, каб не пераляжаў ні адной мінуты. Там, дзе траста выляжала, яе часткамі падымаюць са сцелішча.

— Індывідуальная здзельшчына стварае ўмовы для лепшай ўдарнай работы—расказваюць калгасніцы. Кожная імкнецца больш выпрацаваць.

Праца ў часе падʼёму ільну са сцелішча арганізавана добра. Вось у адным баку калгасніцы падымаюць лён, а там глядзі—ужо вяжуць і кладуць снапы на воз. Падвода адвозіць трасту і хутка парожняя варочаецца, каб зноў яе напоўнілі снапамі.

— Сёлета мы пасеялі 25 га ільну,—кажа брыгадзір брыгады № 1 тав. **Герцык.**—Пасеялі на лепшай зямлі—на клевярышчы і бульбянішчы. Начыста два разы прапалолі і своечасова выцерабілі. Таму ўраджай ільну ў калгасе добры. Трасту здаём нумарамі 1,50—1,75—2.

Разрыву паміж церабленнем і расцілам—не было. Як толькі лён выцерабілі, зараз-жа абмалацілі і 26 жніўня калгас здаў дзяржаве 11 тон 260 кгр. ільнонасення. Потым—адразу-ж разаслалі.

Калгасніцы зразумелі, што лён—багацце, што ад догляду і апрацоўкі яго залежыць якасць валакна. Лепшыя ўдарніцы працавалі ўзорна, ніколі не лічыліся з часам. Вось напрыклад **Півавар** Ліда. На праполцы, церабленні і другіх працэсах яна перавыконвала нормы і здавала добрую якасць. За гэта праўленне прэміравала яе парасёнкам. Добра працавала і **Курсевіч** Каця.

Баўдзіленка Дуня паказала ўзоры работы па расцілу. Пры норме расціла 0,25 га у дзень, яна расцілала па 0,40 і больш. Не горшыя паказальнікі мае і **Гайко** Еўгенія па падʼёму са сцелішча—0,34 га, пры норме—0,25.

Надворʼе было дрэннае ў часе церабленя, трэба было спяшацца з уборкай, хутчэй звезці лён з поля. Гэта добра зразумелі калгасніцы. Бывала яшчэ цемнавата, а **Ламач** Таццяна ўжо на полі. Не адна яна зразумела ўсю адказнасць у гэтай рабоце. Не адставалі і **Шарлай** Елена, **Тоўпінец** Проська, **Баўдзіленка** Пелагея, **Скорба** Варвара, **Скарбнеўская** Дуня і рад іншых.

У хутчэйшай уборцы ільну дапамаглі і свінаркі **Шарлай** Марыля і **Парфіновіч** Яніна. У вольны час яны прыбягалі на поле і дапамагалі церабіць, а потым аббіваць галоўкі.

Брыгада № 1—брыгадзір **Герцык** лічыцца перадавой у калгасе па ўсім паказальнікам. Яна кандыдат на атрыманне пераходнага чырвонага сцягу. Да 8 верасня ўвесь лён першай брыгадай быў паднят са сцелішча і звезен з поля. А праз пару дзён гэта работа была скончана па ўсяму калгасу.

Такімі-ж тэмпамі прыступілі да сартавання трасты і здачы яе на ільнозавод.

Е. Эпштэйн.

ПРЫЛІЎ У КАЛГАС

Нядаўна ў калгас „1 мая", Перасадскага сельсовета, Барысаўскага раёна, уступіла 6 аднаасобных гаспадарак.

Актыўны ўдзел у масавай рабоце па ўцягненню аднаасобнікаў у калгас прынялі калгасніцы **Сермяжка** Антаніна, **Буцько** А., **Пашкевіч, Аніскевіч** Фёкла і іншыя. Яны на вопыце свайго заможнага, радаснага жыцця даказвалі карысць калгасаў.

— Дакуль вам сядзець на сваёй палосцы, часта гаварыла аднаасобнікам **Сермяжка** Антаніна. Чаго вы дачакаецеся? Глядзіце, як з кожным годам растуць і мацнеюць калгасы, расце добрабыт і заможнасць калгаснікаў. Ці-ж мела я такое добрае жыццё ў аднаасобнай гаспадарцы?

Так часта выступалі і **Буцько, Пашкевіч, Аніскевіч.** І гэтыя простыя словы, гэтыя доказы пераканалі аднаасобнікаў.

П. Буслаў.

— Як звяры мы жылі раней,— кажа **Сянкевіч** Кацярына з калгаса „Пералог"—жылі на хутарах, далёка адзін ад другога, працавалі да стомы на сваіх вузенькіх палосках і не ведалі, што робіцца навакол нас. Нудна цягнуўся час!

— Зусім не тое зараз,—працягвала яна—дружная праца на калгасных палях, вясёлыя песні, смех. Зараз і працаваць цікава і час бяжыць хутка. Майму старому ўжо 60 год, а штодзённа ён ходзіць на работу, не хоча заставацца дома.

Толькі дружнай і ўпартай работай калгаснікаў і калгасніц калгас „Пералог" дабіўся поспехаў у рабоце і ідзе перадавым у Амельянаўскім сельсавеце. На 28 жніўня выцерабілі ўвесь лён, аббілі яго і разаслалі. Адказная па ільну **Зейман** Юля добра арганізавала работу. Калгасніцы штодзённа перавыконвалі нормы. Нават 65-гадовая **Жданок** Ганна прыкладам сваёй працы прымушала падцягвацца адставаўшых жанчын. Дзяўчаты-падросткі таксама дапамагалі: 13-гадовыя **Каня** Наташа, **Лазарчык** Моця і другія штодзённа аббівалі да 120 снапоў лёну.

Ударна ў калгасе ўбралі і зернавыя. Шмат у калгасе жанчын, якія паказалі ўзоры прыкладных адносін да соцыялістычнай працы. Калгасніцы **Маскалевіч** Мальвіна, **Данейка** Анна, **Жанеўская** Анюта і **Жанеўская** Вера спраўляліся вязаць снапы за жняяркай, якая зжынала па 4,5 га зернавых у дзень. На ручным жніве **Зубовіч** Фрачя, **Шахлай** Надзя і **Шахлай** Соня зжыналі ў дзень 18—19 сотак га жыта пры норме—12 сотак.

Снапы ноччу звозілі з поля, падсушвалі і адразу з-пад малатарні лепшае зярно здавалі дзяржаве і натураплату МТС. Барабаншчыкі — **Яблонскі** Тамаш і **Яблонскі** Адам веярамі спускалі снапы ў малатарню, якая давала за змену да 900 пудоў зярна. За кожныя 16 кгр. намалочанага зярна брыгадзе налічвалі 8 сотых працадня. Бывалі дні, калі брыгада зарабляла 72, а барабаншчыкі - па тры працадні.

Малатарня не рабіла халастых прагонаў. Падавальшчыцы **Сімановіч** Надзя, **Жданок** Вара і **Баграцэвіч** Надзя своечасова і добра падавалі барабаншчыкам снапы.

Пры такой адданай рабоце калгаснікаў і калгасніц калгас „Пералог" 25 жніўня поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па абавязковым пастаўкам, а 29 жніўня закончыў здачу натураплаты за работу МТС.

Смалявіцкі раён. **М. Жук.**

КУЛЬТУРНЫ АДПАЧЫНАК

У калгасе імя Косарэва пабудавалі клуб на 650 чалавек. На другім яго паверсе адчынена чытальня на 100 чалавек. Усюды расстаўлены крэслы і столікі, на якіх стаяць вазоны з кветкамі. Партрэты нашых правадыроў, фота-мантажы, люстры ўпрыгожваюць сцены клуба. Маецца фізгармонія. Арганізавана раздзявальня, дзе калгаснікі і калгасніцы знімаюць свае пальто пры ўваходзе ў клуб.

Тут разгарнулі сваю работу харавы і драматычны гурткі. Абсталяваны фізкультурная і валейбольная пляцоўкі, гіганцкія крокі.

Весела і культурна праводзяць свой вольны час нашы калгаснікі і калгасніцы.

Крыўчанаўскі сельсавет Брагінскага раёна. **Ціханчук Лена.**

Калгасныя частушкі

У нашай Броніцы бывала
Дрэнна маладзёж гуляла;
Альбо карты, альбо п'янка,
А цяпер сюды заглянька!

Усюды зараз на сяле
Комсамол стаў на чале:
Ўжо ні карты і ні п'янка,
А культурная гулянка.

Ну і хлопцы комсамольцы!
Як ні хвастацца тут ўсім.
Чыста вопратка, прычоска,
На грудзях чырвоны КІМ.

І дзяржаве памагаюць
Ўсе пастаўкі выпаўняюць,
І рыхтуюцца рэбяты
Калектыўна святкаваць.

Гэта свята ўсім вядома,
Знае стар і знае мал,
Што з семнаццатага году
Наш народ свабодным стаў.

Мы страчаем свята ярка,
Дружнай песняй маладой
Ужо ні дробнай гаспадаркай,
А калгаснай грамадой.

Саша Янкова.

Даярка калгаса „Перамога" Буда-Кашалёўскага раёна.



Саша Янкова.

СТАРШЫНЯ

На яе загарэлым твары заўсёды ўсмешка. Яе тонкая рухавая постаць, імклівая паходка і звонкі дзявочы голас неяк удала дапаўняюць бадзёрую натуру. Цяжка ўявіць яе сумнай і панурай.

Такой вясёлай яе—старшыню сельсовета Зінаіду Іванаўну **Аляшкевіч** ведаюць усе—дарослыя і малыя, калгаснікі і аднаасобнікі.

Вось яна ў канцылярыі. Дзень на зыходзе. Сельсовет амаль пусты. Глуха ляскаюць шчоты, шуршаць паперы. Зінаіда Іванаўна падводзіць рахунак грошам.

— Бачыш, Мінкоў?—паказала яна сакратару 4 костачкі шчотаў.

— Чатыры тысячы? Гэта сёння за дзень?—здзіўляецца сакратар.

Старшыні не падабаўся адказ. Шчокі яе зарумяніліся і вусны моцна сціснуліся.

— А трэба 67 тысяч аднаго падатку. Што-ж тут дзіўнага? Ты ж старшыня фінансавай секцыі. Ты ж слаба работаеш і здзіўляцца тут якраз няма чаму.

Мінкоў засароміўся ні то за сваю слабую работу, ні то ад сур'езнага погляду старшыні. Паабяцаў склікаць членаў секцыі і разгарнуць шырокую, баявую работу.

Канцылярыя сельсовета прадстаўляе сабой два ўтульных пакойчыка. Сцены выклеены шпалерамі, падлога заўсёды чыстая, вокны завешаны гардзінамі, устаўлены вазонамі. Кожнаму работніку асобны стол, крэсла, чарнільны прыбор. Для наведвальнікаў—лаўка і крэслы. Вакол дома клумбы рознакаляровых кветак. Ганак густа апавіт зялёнай фасоллю.

— Адразу відаць, што ўключыліся ў конкурс на лепшы сельсовет!

—А як-жа? Ды ці толькі гэта? Мы многа чаго зрабілі, адразу не заўважыш,—расказвае тав. Аляшкевіч. Вось хоць-бы заявы. Паспрабуйце знайсці ў нас хоць адну неразгледжаную заяву.

— І ўсе задаволены?

— Як гэта задаволены? Мы па закону глядзім: каго задаволіць, а каму адмовіць. Мы-ж не маглі задаволіць 22 аднаасобнікаў, якія скардзіліся на налічаны ім падатак. Не паверылі яны нам, падалі заяву ў ЦВК і адтуль прыязджаў таварыш на праверку. Але што правяраць, калі ўсё зроблена па закону. Наогул за 10 месяцаў маёй работы ў сельсовеце не заўважана ніводнага выпадка парушэння рэволюцыйнай законнасці. А наш сельскі суд лічыцца лепшым у рэспубліцы і старшыню суда тав. **Казакова** выклікалі сёлета ў Маскву на нараду.

Калгасы сельсовета арганізацыйна і гаспадарча ўмацаваліся. Калгас „Комінтэрн" лічыцца адным з лепшых у раёне, а яго знатная калгасніца Праскоўя Вячыстая была дэлегаткай другога ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў ударнікаў. За паспяховую работу РВК прэміраваў старшыню паляводчай секцыі тав. **Белінскага.** Прэміраван таксама сельсовет і рад калгасаў. Увесь год сельсовет знаходзіцца на раённай чырвонай дошцы.

Вялікія поспехі дасягнуты ў развіцці жывёлагадоўлі. Звыш плана выгадавалі 70 цялят і 30 парасят. За ўзорную пастаноўку жывёлагадоўчай справы калгас „Комінтэрн" атрымаў першую прэмію ў раёне.

Тав. Аляшкевіч.

Школамі сельсовет займаецца літаральна кожны дзень. Пратаколы пасяджэнняў культсекцыі запоўнены пытаннямі рамонта школ, забеспячэннем апалам, падручнікамі, укамплектаваннем настаўнікамі. І зараз, калі шумная дзетвара вось ужо займаецца ў школе, сельсовет упэўнен, што нармальнай вучобе нішто не перашкодзіць.

10 секцый—100 лепшых калгаснікаў, рабочых соўгаса, настаўнікаў, 100 актывістаў пад кіраўніцтвам Зінаіды Іванаўны робяць у калгасах, на жывёлагадоўчых фермах і школах і на дарогах сваю справу, апраўдваюць званне ўдарнікаў у перадавым сельсовеце.

У гэтым—у шырокай масавасці „сакрэт" поспехаў сельсовета. Велізарная заслуга тав. Аляшкевіч у тым, што яна спаяла навакол сельсовета такі актыў, які штодзённа дапамагае ёй у рабоце.

* * *

— Калі-б вы ведалі, як я выраслa за гэтыя 10 месяцаў работы ў сельсовеце,—кажа т. Аляшкевіч. Мая работа здаецца мне самай цікавай, якую я калі-небудзь сустракала. Тое, аб чым я раней не мела нават ўяўлення, стала цяпер ясным.

Цяпер смешным здаецца выпадак, які меў месца ў мінулым годзе пасля выбараў яе старшынёй. Парторг сельсовета і намеснік старшыні тав. **Прудніk**, недаверліва паглядзеўшы на першыя нясмелыя крокі старшыні, параіў ёй:

— Ты, тав. Аляшкевіч, сядзі ў канцылярыі. Прымеш наведвальнікаў, падпішаш паперкі, а я буду на раёне.

Першыя дні так і было. Але праз тыдзень, пазнаёміўшыся з работай, яна заявіла Прудніку:

— Кіраваць усім сельсоветам буду я, а ты, як намеснік, дапамагай мне.

І з таго часу Зінаіда Іванаўна моцна трымае кіраўніцтва.

Я. Алісімчык.

Чырвонапольскі сельсовет, Магілеўскі раён.

БЛОНЬ



Дзевяць прысадзістых будынкаў, паблісквaючы вокнамі, выстраіліся на квяцістым узгорку. Тут размясцілася племянная свінаферма соўгаса „Блонь“. Гэта самае зручнае месца. З аднаго боку—цёмны стары лес, належаўшы калісці памешчыку Бонч-Асмалоўскаму, з другога—шырокія калгасныя палі, ахутаныя празрыстым туманам далечы.

З-за рэчкі, з вёскі Блонь, якая прытулілася недалёка ад свінафермы, у 1931 годзе прышла ў соўгас Лена Мігуцкая.

Спачатку працавала свінаркай. Незвычайнаю здавалася справа—тут і свінарнікі чыстыя і догляд не такі, як у звычайнай гаспадарцы, і свінні племянныя. Да ўсяго трэба было падыходзіць асцярожна, удумліва. Шмат было клопатаў Лене, пакуль азнаёмілася з распарадкам работы.

Але праз некаторы час Лену пачалі заўважаць, з'явілася нават заметка ў газеце. Тады, помніцца Лене, яна, шчаслівая ад такой павагі, не магла заснуць. Пад падушачкай ў яе ляжала старанна складзеная газета, у якой пісалася аб лепшых свінарках соўгаса, сярод якіх значылася і яна.

— А цяпер я працую брыгадзірам свінаматачнай брыгады,—зазначыла Лена.—У маёй брыгадзе пяць свінарак: **Еўсейчык** Наташа, **Федарынчык** Алеся, **Буцэнец** Наташа, **Сушкевіч** Лёня, **Ніскевіч** Поля. Разам мы даглядаем 25 свінаматак, 128 сысуноў і 64 ад'ёмышаў. А парасяткі, якія ў нас, вы толькі паглядзеце! Беленькія, поўныя—чыстай ангельскай пароды.

Захопленая расказам Лена непрыкметна прывяла нас у свой свінарнік. Па чыстым і прасторным цэментаваным калідоры мы ішлі каля такіх-жа чыстых і прасторных станкоў, у якіх соладка адпачывалі пасля сытнага корму велізарныя ангельскія свінаматкі. Тут-жа ў спецыяльных станках ляжалі ружовыя парасяты-ад'ёмышы.

— Да чатырох месяцаў,—растлумачвала нам Лена,—мы трымаем іх у сябе, а потым, падзяліўшы на групы, здаем другім брыгадам. Глядзім за імі, як за дзецьмі. Два разы на дзень—прагульваем, чатыры разы—кормім.

Мы зацікавіліся сярэдняй клеткай. Прылёгшы на чыстую, драўляную падлогу ля сваіх парасят, ляжала пульхная „Чараўніца“. Гэтае дзіва прыроды, племянная свінаматка апарасіла парасят больш, чым у яе саскоў. Таму некаторых даводзілася падсаджваць другім свінаматкам, альбо падкарміваць. І толькі дзякуючы добраму догляду брыгады Мігуцкай все 14 штук былі выгадаваны.

— Яшчэ лепш работалі-б мы,—кажа Лена, каб не наша кухня, якая часта ці не даварыць, ці пераварыць свіную ежу, альбо дасць недобраякасны корм. Ад гэтага панос у парасят і розныя непрыемнасці.

Ёсць таксама перабоі і ў забеспячэнні свінарніка вадой.

Але, не гледзячы на гэтыя недахопы, брыгада Мігуцкай па якасці работы і выкананню плана з'яўляецца адной з перадавых. Яе брыгада выгадавала 379 парасят высокай класнасці. Не дарма Лену чатыры разы прэміравалі, не дарма сярод знатных людзей соўгаса „Блонь“ значыцца і яе прозвішча.

Не менш значным і адказным цэхам свінафермы соўгаса лічыцца брыгада **Баёк** Ольгі. У яе брыгадзе працуюць тры свінаркі: **Сарачынская** Надзя, **Гусанкова** Саша, **Іовіч**. 270 штук племянных класных храчкоў знаходзяцца на іхняй адказнасці. Тут гадуецца для соўгасаў і калгасаў Беларусі пародзістае племя свіней. Сюды прыязджаюць купляць гатовую прадукцыю. Тут ацэньваецца якасць усёй работы соўгаса—і гэта разумее брыгада Ольгі.

У яе свінарніку чыстата і ўтульнасць, кожная рэч на сваім месцы, кожны храчок сыты і дагледжаны. Маладая комсамолка здолела за кароткі час сваёй работы стаць брыгадзірам-ударніцай, знатным чалавекам свайго соўгаса. Аб ёй пішуць у газетах і ставяць у прыклад. Якжа не радавацца гэтаму?!

Цяжкасцей у рабоце Баёк Ольга не палохаецца. Тэхнікай жывёлагадоўлі ў асноўным яна авалодала, але гэтага, зразумела, яшчэ недастаткова. Ольга адчувае вялікую патрэбу ў далейшай вучобе і шкада, што за апошнія часы тэхвучоба ў соўгасе аслабла. Дырэкцыі соўгаса неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на разгортванне тэхвучобы сярод брыгадзіраў.

С. Дарожны.

Соўгас „Блонь“,
Пухавіцкі раён.

ЗЛАЧЫННАЯ ЭКАНОМІЯ

— Чым-жа буду я дзяцей карміць? Выдай прадуктаў ці грошай.

— Адстань! Грошы мне самому патрэбны.

Такая гутарка адбывалася не раз паміж Маняй **Бараноўскай**—загадчыцай калгаснымі яслямі і тав. **Верыменка**—старшынёй Роза-Люксембургскага сельпо.

Бывала паспрачаюцца, паспрачаюцца і пойдзе Маня ні з чым. Па праўдзе кажучы, спрэчкі гэтыя праходзілі заўсёды ў вельмі мірным тоне. Нават спрэчкамі назваць гэтага нельга. Так проста, сыйдуцца людзі, абмяняюцца думкамі, убачаць, што аднадушша ім не дабіцца і мірна разыйдуцца.

Верыменка ніяк не можа зразумець, чаго яна прыстае да яго. Праўда, на рахунак сельпо пераведзены для ясель 15 тыс. руб. Зразумела, што на гэтыя грошы яслі маглі-б вельмі добра работаць, можна было-б і памяшканне абсталяваць і харчаванне дзяцей наладзіць. Але Верыменка „самаму“ вельмі патрэбны грошы. І аднёсся ён да гэтых грошай, як да сельпоўскіх. І сапраўды 15 тысяч—сума не маленькая, ёю можна добра ажывіць звароты сельпо.

— А яслі?.. Нічога, пачакаюць,—думае Верыменка. Выдадзена ім з пачатку года да 15 жніўня прадуктаў на дзве з паловай тысячы, і за тое хай дзякуюць.

І чаго, уласна кажучы, ім не хапае? Раніцой—суп, у дзень—бульба, увечары—суп. Значыцца не галадаюць дзеці. Чаго-ж турбаваць яго, адказнага работніка? У яго і без ясель спраў не мала.

Праўда асабліва скардзіцца на настойлівасць Мані Бараноўскай Верыменка не прыходзіцца. Скажаш ёй, што няма часу, што няма грошай, што няма прадуктаў,—і пойдзе яна.

— Што-ж я з ім рабіць буду? Ды і на што я грошы выдаткаваць буду? Дзеткі ў мяне і так сыты, і апрануты, і абуты—кажа Маня.

Справа ў тым, што Ельскія курсы па падрыхтоўцы лашкольных работнікаў, дзе вучылася Маня, былі пастаўлены вельмі дрэнна. Ніхто не растлумачыў юным выхаванкам, што дзяржава адпускае такую вялікую суму грошай для ясель, каб паставіць дзяцей калгаснікаў у найлепшыя культурныя ўмовы, каб палепшыць харчаванне малышоў і даць магчымасць мацеры-калгасніцы працаваць у полі і на грамадскай рабоце ў поўным спакоі.

Аднак мацеры з калгаса „Шлях рэволюцыі“, дзе работае Бараноўская, не вельмі давяраюць яслям. Памяшканне і штат разлічаны на 56 дзяцей, наведвае яслі толькі 39. Яно і зразумела: кожная калгасніца зараз, калі матэрыяльнае становішча яе значна палепшылася, корміць сваё дзіця дома значна лепш. А ў яслях „Шлях рэволюцыі“ дзеці сядзяць без масла, без мяса, без цукру.

І ўсё гэта з-за спакойнага характару Бараноўскай і злачыннага скарыстання ясельных грошай „лоўкім“ старшынёй сельпо!

Але такое становішча мы бачым не ў адным толькі Роза-Люксембургскім сельсавеце.

На дзённыя яслі ў калгасе „Энергія“, Санюкоўскага сельсавета таго-ж Ельскага раёна, адпушчана 13 тысяч руб. Аднак да гэтага часу не скарыстана і чацвертая частка гэтай сумы. Кормяць дзяцей, як беднякі кармілі ў мінулы час. Аб блінчыках, аб катлетках, аб пячэнні дзеткі і не ведаюць. А між тым такімі спажыўнымі і смачнымі блюдамі можна было-б карміць дзяцей на адпушчаныя дзяржавай для гэтай мэты грошы. Засталося-б яшчэ і на цацкі.

Вынікі відавочны: замест 60 у яслі прыносяць толькі 25 дзяцей.

Не лепш абстаіць справа ў яслях калгаса „Шлях соцыялізма“ Васінцоўскага сельсавета.

10.860 руб. адпушчана гэтым яслям на 1935 год, а к 15 жніўню выдаткавана толькі каля трох тысяч руб. Грошы знаходзяцца ў распараджэнні старшыні калгаса.

На яслі калгаса „Чырвоная зара“ Багуцкага сельсавета адпушчана 7 тысяч рублёў, а выдаткавана к 15 жніўню толькі дзве тысячы рублёў. Яслі разлічаны на 50 дзяцей, а наведваюць іх толькі 30. Загадчыца ясель **Джум** Надзя са сваёй работай не спраўляецца.

Пытанне аб „парадках“ у гэтых яслях разбіралася на прэзідыуме сельсавета. Праўленню калгаса даручана пераглядзець штаты ясель і наладзіць дастаўку прадуктаў для дзяцей, але да гэтага часу нічога не зроблена. Старшыня калгаса **Козінцаў** лічыць, што яслі не заслугоўваюць яго ўвагі. Так працягвацца больш не можа. Становішча ў яслях Ельскага раёна нельга лічыць здавальняючым. І Наркамат Аховы Здароўя і раённыя арганізацыі павінны звярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу. Такая „эканомія“ 200 тысяч рублёў, адпушчаных дзяржавай спецыяльна на яслі Ельскага раёна, з'яўляецца проста злачынствам.

С. Чорная.



Дзіцячы сад калгаса „Шлях комунізма“ Аршанскага раёна.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Усе мы ведаем, што ў Совецкім Саюзе багата ўвагі аддаюць дзецям. У нас існуюць узорныя яслі, якія рыхтуюць добрую, здаровую змену. Усе работніцы і сялянкі капіталістычных краін зайздросцяць нам у гэтым.

На яслі нашага калгаса „Шлях соцыялізма“ на 33 дзяцей дзяржава адпусціла велізарную суму—10.860 руб. Гэтымі грашыма распараджаецца старшыня калгаса тав. **Еўлаш**. Ён ўзяў на сябе забеспячэнне ясель прадуктамі, а атрымоўваем мы толькі—бульбу, крупу і вельмі рэдка масла. Мяса мы не бачым ніколі. Асноўная наша страва—бульба.

Дапамажыце нам арганізаваць яслі, так як гэтага чакае ад нас дзяржава, адпускаючы нам такія вялікія сумы.

Харашкевіч Сцёпа

Ельскі раён.

ПАРАДЫ ЦЯЖАРНЫМ

(Пісьмо чацвертае)

У мінулым пісьме я пісаў аб тым, што совецкая ўлада прымае ўсе меры для таго, каб праца жанчыны адбывалася пры самых спрыяючых умовах. Органы Аховы Мацярынства і Младзенцтва пабудавалі і будуюць у гарадах і на вёсках кансультацыі для цяжарных, дзе кожная цяжарная можа атрымаць патрэбныя парады і ўказанні, як яна павінна трымаць сябе ў часе цяжарнасці, каб цяжарнасць і роды працякалі лёгка і без ускладненняў.

Апрача таго, паводле законаў совецкай улады аб ахове працы, працоўныя жанчыны аслабаняюцца ад працы на 6—8 тыдняў да родаў і на 6—8 тыдняў пасля родаў, а калгасніца на адзін месяц да і пасля родаў. Далей цяжарная жанчына аслабаняецца ад працы ўночы, і калі яе праца звязана з цяжкасцямі, то яе пераводзяць на лёгкую работу, не шкодную для яе здароўя. Усё гэта робіцца для таго, каб яе цяжарнасць працякала нармальна і каб яна радзіла здаровае дзіця.

Што-ж гігіена прапісвае цяжарнай жанчыне?

Як яна сама павінна трымаць сябе ў час цяжарнасці?

Кожнай жанчыне вядома, што першая прыкмета цяжарнасці гэта спыненне менструацый. Іншыя адзнакі—гэта набраканне грудзей, лёгкае недамаганне, часамі агіднасць да мясной стравы, млоснасць і нават ваніты. У гэты час жанчына павінна звярнуцца ў кансультацыю для цяжарных, ці ў больніцу да доктара, альбо да акушоркі, каб выявіць, ці сапраўды пачалася цяжарнасць, які тэрмін цяжарнасці і ці правільна яна праходзіць. Доктар разам з гэтым вымерыць таз, г. зн. тое касцяноё кальцо, праз якое павінна прайсці дзіця ў час родаў. Апрача таго, доктар выслухае лёгкія, сэрца, агледзіць іншыя органы і дасць патрэбныя парады, як сачыць за сабой, як вясці сябе на працягу ўсёй цяжарнасці.

Вельмі важна, каб жанчына запомніла ці запісала, калі ў яе пачаліся апошнія рэгулы (дзень і месяц). Тады магчыма вызначыць тэрмін родаў. Як правіла, цяжарнасць працягваецца 9 каляндарных ці 10 лунных месяцаў, г. зн. 40 тыдняў (289 дзён). Для вызначэння тэрміну родаў, трэба ад першага дня апошніх рэгул адлічыць 3 месяцы і затым дадаць 7 дзён. Калі напрыклад, першы дзень апошніх менструацый быў 15-га лістапада, то, адлічыўшы 3 месяца, атрымаем 15 жніўня і дадаўшы 7 дзён, вызначым, што роды павінны наступіць 22 жніўня. Бываюць рэдкія выключэнні, калі роды адбываюцца на 1—2 тыдні раней ці, наадварот, на 2—3 тыдні пазней.

Такім чынам, старайцеся ўжо ў пачатку цяжарнасці быць даследаванымі ўрачом кансультацыі ці бальніцы, але не шукайце дапамогі і парады ў старых баб ці ў іншых невукаў. Калі ў вас няма магчымасці звярнуцца ў кансультацыю для атрымання парады, то самі запамятайце наступныя парады:

1. У час цяжарнасці, асабліва ў апошнія месяцы не стамляйце сябе цяжкой фізічнай працай, не паднімайце цяжкога, не хадзіце пехатой да стамлення, не ездзіце па дрэннай дарозе і на дрэнных калёсах.

2. Не ўжывайце пры ядзе нічога салонага, вельмі кіслага, вострага (як селядзец, воцат, гарчыца, хрэн, копчаная каўбаса і т. д.). Лепшай ядой для цяжарнай можа быць: малако, масла, смятана, сыракваша, яйкі, гародніна, фрукты, ягады і трохі мяса.

3. Не піце гарэлкі, піва і віна, бо спіртныя напіткі шкодны не толькі вам, але і вашаму будучаму дзіцяці.

4. Сачыце за тым, каб не было ў вас запораў. Часамі добра дзейнічае кіслае малако, садавіна, шклянка вады з ранку нашча. У крайнім выпадку рабіце 2—3 разы на тыдзень клізму. Слабіцельных лякарстваў без парады ўрача не прыймайце.

5. Не насіце цеснай адзежы і абутку. Не падвязвайце спадніцы паясамі і не насіце на нагах круглых падвязак.

6. Сачыце за чыстатой свайго цела, асабліва палавых органаў. Мыйцеся часта ў лазні (але не парцеся). Штодзённа абмывайце надворныя палавыя органы цёплай перагатаванай вадой з мылам, а пры белях—два разы на дзень.

7. Імкніцеся часцей бываць на свежым паветры, праветрывайце свой пакой, адчыняйце часцей фортачку і не спіце ў цёмным і душным пакоі.

8. Вядзіце правільны спосаб жыцця, не сядзіце да позняй ночы і спіце не менш 8 гадзін у суткі.

9. Пачынаючы з 6-га месяца цяжарнасці абцірайце штодзённа сыскі грудзей халоднай вадой. Гэта робіцца для таго, каб пры будучым кармленні дзіцяці сыскі не лопаліся.

10. У час цяжарнасці часта псуюцца зубы, а таму іх трэба лячыць і апроч таго штодзённа перад сном чысціць шчотачкай і парашком.

11. У апошнія 2 месяцы не майце палавых зносін.

12. Пры з'яўленні ацёкаў на нагах адразу-жа наведайцеся ў кансультацыю ці ў бальніцу да доктара і прынясіце мачу для даследу, таму што ў цяжарных нярэдка захворваюць ныркі ды наогул трэба на працягу ўсёй цяжарнасці, асабліва ў другой палове, некалькі разоў зрабіць аналіз мачы. Патрэбна адразу звярнуцца да доктара, калі ў вас пакажацца кроў. Парайцеся таксама з доктарам, калі ў вас ў апошнія месяцы цяжарнасці будуць адчувацца болі галавы ці будзе рвота і т. д.

Калі вы будзеце выконваць усе гэтыя парады, то цяжарнасць ваша будзе праходзіць нармальна, роды будуць у вас лёгкія і без ўсякіх ускладненняў.

Доктар А. Полак.

Цана асобнага нумара 20 кап.

ЖАНОЧЫ ЖУРНАЛ У МАЛАДЗЁЖНУЮ МАСУ

Прачытаўшы пастанову ЦК ВЛКСМ аб рабоце сярод жаночай моладзі, я рашыў, што гэта датычыцца кожнага комсамольца і на рабоце і ў быту.

Я—пачтовы агент. Чым я ў рабоце сваёй магу дапамагчы ажыццяўленню гэтай пастановы?—думаў я.

Успомніў, што журнал „Работніца і калгасніца Беларусі",—адзіны ў нашай рэспубліцы орган, які паказвае работу і жыццё нашых знатных людзей,—лепшых ударніц прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Акрамя таго журнал гэты асвятляе культурна-бытавыя пытанні работніц, калгасніц і працоўных аднаасобніц і змагаецца з рэшткамі старога быта.

План распаўсюджання газет і журналаў я выконваю заўсёды на 100 проц. Але мне стала яскрава, што жаночы журнал чытаюць яшчэ не ўсе нашы дзяўчаты. Узяўся я за работу і план распаўсюджання гэтага журнала выканаў на 250 проц. У гэтым значную дапамогу мне аказаў старшыня калгаса „Беларускі Комунар" тав. Кукалка.

Цяпер я праводжу чытку журнала калгасніцам у поле, у час абедзенага перапынку.

Выклікаю ўсіх пачтовых агентаў паследаваць майму прыкладу.

Нікалай Буднік.

Ельскі раён, пачтовае аддзяленне Кузмічы

ПА СЛЯДАХ РАБСЕЛЬКОРАЎСКІХ ПІСЕМ

У пісьме ў рэдакцыю, настаўніца Ровенскай школы Сіроцінскага раёна тав. **Сіняўская** пісала, што Старынаўскі сельсовет не выплаціў ёй поўнасцю грошай за водпуск па цяжарнасці. А тэхнічцы школы тав **Якубавай** сельсовет не выплаціў зарплату за снежань 1934 года.

ЦК Саюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы БССР, куды было накіравана пісьмо, паведаміла нас, што Сіняўскай і Якубавай поўнасцю выплачаны належачыя ім грошы.

* * *

Селькорка з Пухавіцкага раёна напісала ў рэдакцыю аб злачынствах малалетняга праступніка вёскі Сытнікі **Альгерчыка** Кастуся. Міліцыя аднойчы яго затрымала і выпусціла, а цяпер ён зноў працягвае свае агідныя справы.

Пісьмо рэдакцыя накіравала Пухавіцкаму райпракурору. Справа слухалася ў Пухавіцкім Нарсудзе, які асудзіў Альгерчыка на 5 год пазбаўлення волі.

* * *

Рэдакцыя атрымала пісьмо аб дрэнным доглядзе дзяцей у яслях соўгаса Рудабелка, Глускага раёна.

Пісьмо было накіравана Глускаму райздраву для расследвання і тэрміновага рэагавання. Але замест сапраўднага рэагавання і прыняцця мер да вінаватых, „ЧВА загадчыка райздрава" прыслаў у рэдакцыю адносіну, у якой ён пацвярджае амаль усе факты, указаныя ў заметцы, але аб прынятых мерах—ні слова.

Гэта—яўная бюракратычная адпіска. Мы патрабуем чоткага адказа, што зроблена Глускім райздравам па палепшанні работы ясляй соўгаса „Рудабелка".

Работніцы, жонкі рабочых, калгасніцы, працоўныя аднаасобніцы!

ЧЫТАЙЦЕ І РАСПАЎСЮДЖВАЙЦЕ СВОЙ ЖУРНАЛ

„Работніца і калгасніца Беларусі"

ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б

ЖУРНАЛ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 12 месяцаў	4 руб. 80 кап.	На 3 месяцы	1 руб. 20 кап.
„ 6 „	2 „ 40 „	„ 1 „	— „ 40 „

Падпіска прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленнях і ў лістаносцаў

У ГЭТЫМ НУМАРЫ ПАДПІСЧЫКАМ ДАСЫЛАЕЦЦА БЯСПЛАТНА ЎКЛАДКА-ВЫКРАЙКА

Выданне ЦК КП(б)Б

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Ленінская 13, клуб друкароў, 2-гі паверх. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 853 Тыраж 7.570. Галоўлітбел № 3221

Здача ў набор 15.IX—35 г. Падпісана да друку 27-IX—35 г. У нумары 2[illegible] арк. 120.140 друк. знакаў